Министерство образования Республики Беларусь

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«ГРОДНЕНСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ
ИМЕНИ ЯНКИ КУПАЛЫ»

# СОВРЕМЕННЫЕ ИНТЕГРАЦИОННЫЕ ПРОЦЕССЫ И РЕСПУБЛИКА БЕЛАРУСЬ: ЕВРОПЕЙСКИЙ И ЕВРАЗИЙСКИЙ КОНТЕКСТ БЕЛОРУССКАЯ ПОЛИТОЛОГИЯ: МНОГООБРАЗИЕ В ЕДИНСТВЕ

Материалы VI Международной
научно-практической конференции

15-16 мая 2014 года

Гродно

Республика Беларусь

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гродно
ГрГУ им. Я.Купалы
2014

УДК 321(476)
ББК 66.0
С56

Редакционная коллегия:
*В. Н. Ватыль*, доктор политических наук, профессор (гл. редактор);
*Н. Н. Гончаров*, кандидат исторических наук, доцент;
*О. В. Лапа*, кандидат политических наук, доцент;
*Л. И. Цыганкова*, кандидат философских наук, доцент;
*А. С. Габрусевич*, старший преподаватель;
*К. В. Гиль*, лаборант кафедры, технический секретарь.

С56 **Современные** интеграционные процессы и Республика Беларусь: европейский и евразийский контекст. Белорусская политология: многообразие в единстве : материалы VI междунар. науч.-практ. конф. (Гродно, 15 – 16 мая 2014 г.). В 2 ч. Ч. 1 / ГрГУ им. Я. Купалы ; редкол.: В. Н. Ватыль (гл. ред.) [и др.]. – Гродно : ГрГУ, 2014. – 327 с.
ISBN 978-985-515-749-7 (ч. 1)
ISBN 978-985-515-748-0

Представлены основные направления развития отечественной политологии в ее органическом сочетании с мировой. Значительное место уделено анализу перспектив политического знания и политологии в Республике Беларусь. Сборник будет полезен и интересен студентам, аспирантам, преподавателям социально-гуманитарных дисциплин, представителям практической политики.

**УДК 321(476)**
**ББК 66.0**

**ISBN 978-985-515-749-7 (ч. 1)**
**ISBN 978-985-515-748-0**

© Учреждение образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы», 2014

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Президент Республики Беларусь А. Г. Лукашенко отметил, что мы своим примером подтолкнули весь ход интеграции на постсоветском пространстве, и не будь опыта союзного строительства – не было бы и Таможенного союза [3].

На заседании межгоссовета ЕврАзЭС (Высшего органа Таможенного Союза) 9 декабря 2010 г. президенты Беларуси, Казахстана и России отметили, что уже сформировано договорно-правовая база Единого экономического пространства в рамках Единого экономического сообщества. С 1 января 2012 г. вступили в действие подписанные соглашения и Единое экономическое пространство Беларуси, Казахстана и России начало функционировать.

Очередной этап интеграции – это создание Евразийского экономического союза.

*Список литературы*

1. О государственном суверенитете Республики Беларусь: Декларация Верховного Совета Республики Беларусь от 27 июля 1990 г. // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2001. – № 2.

2. Договор о создании Союзного государства // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2000. – № 3.

3. Лукашенко, А. О судьбах нашей интеграции / А. Лукашенко // Известия. – 2011. – 19 окт. – С. 1, 5.

**А. І. Бабко**

*(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, г. Мінск, Беларусь, arkadzbabko@gmail.com)*

## ГЛАБАЛІЗАЦЫЯ І НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЯ ІДЭНТЫЧНАСЦЬ: СПРОБА ТЭАРЭТЫЧНАГА АНАЛІЗУ ПРАБЛЕМЫ

Пытанні, звязаныя з феноменам нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, набываюць ва ўмовах глабалізаванага свету асаблівую вастрыню, бо глабалізацыйным працэсам уласцівыя моцныя і трывалыя тэндэнцыі да ўніфікацыі і стандартызацыі грамадскага жыцця. Падставай і апраўданнем згаданых тэндэнцый з’яўляецца іх засведчаная гістарычнай практыкай эфектыўнасць. У сувязі з гэтым можа паўстаць ілюзія, нібыта татальная ўніфікацыя і стандартызацыя (што ахапіла б усе без вынятку сацыяльныя сферы ў сусветных маштабах) паспрыяла б узнікненню ў найвышэйшай ступені прадуктыўнага тыпу грамадства. У яго ўмовах, ва ўмовах адсутнасці звязаных з нацыянальна-культурнай разнастайнасцю перашкодаў інфармацыя магла б перадавацца і перапрацоўвацца значна хут-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чэй, чым цяпер. Таму хутчэй прымаліся б пэўныя рашэнні і, значыцца, больш дынамічным зрабілася б усё грамадскае жыццё. У выніку яго ўсебаковай дынамізацыі і інтэнсіфікацыі кожны індывід атрымліваў бы ўсё большую колькасць жыццёвых даброт і шчадрот, а з імі і ўсё большыя магчымасці для самаразвіцця і самарэалізацыі.

У рэчышчы разгортвання згаданай ілюзіі, такім чынам, заканамерна ўзнікае пытанне пра апраўданасць і легітымнасць памкненняў і высілкаў, скіраваных на захаванне нацыянальна-культурнай адметнасці (а разам з ёй і культурнай разнастайнасці). Сапраўды, ці не варта было б ахвяраваць нацыянальна-культурную спадчыну і культурнае шматгалоссе чалавецтва дзеля стварэння высокаэфектыўнага грамадскага механізма, здольнага вырашаць найскладанейшыя праблемы, распрацаваць і задзейнічаць фантастычныя тэхналогіі і неймаверна пашырыць наш навуковы далягляд? Патрэба ў самаідэнтыфікацыі, якую адчувае кожны індывід, зусім не засталася б у такіх умовах ненатоленай: ужо ў антычную эпоху філасофія знайшла дзейсны сродак для яе задавальнення – прынцып касмапалітызму (хіба не прыемна адчуваць і ўсведамляць сваю ўлучанасць у непадзельную, глабальную людскую супольнасць?).

Неабходна адзначыць, што прымальны і слушны адказ на пастаўленае вышэй пытанне пра магчымасць адцурацца ад нацыянальна-культурнай спадчыны дзеля эфектыўнай арганізацыі грамадства можа быць толькі адмоўным, бо гаворка ў дадзеным выпадку вядзецца пра (небяспечную) ілюзію і не болей, чым ілюзію. Наяўнасць нацыянальна-культурнай разнастайнасці ні ў якім разе не перашкаджае інтэнсіўнаму самаразвіццю чалавецтва на ўсіх яго кірунках. Наадварот, яна належыць да найважнейшых спрыяльных фактараў дадзенага працэсу. Праз нацыянальна-культурную адметнасць у ім здзяйсняецца неабходны для яго момант адмысловасці, які павінен мець трывалы, моцны грунт, каб садзейнічаць яго разгортванню. Сацыяльныя стасункі павінны ўключаць у сябе (і ўключаюць) сегменты, якія адрозніваюцца паміж сабой прызначэннем, ступенню блізкасці іх суб'ектаў, якаснымі характарыстыкамі. Таму кожная асоба мусіць уваходзіць у розныя супольнасці. Уваходжанне ў пэўную нацыянальна-культурную супольнасць далучае яе да пэўнай мовы (а з ёю і да моўнай карціны свету), да гістарычнага досведу, назапашанага дадзенай супольнасцю, і да яе гістарычнай памяці, яно спрыяе засваенню пэўнай ментальнасці, што здзяйсняецца на дадзеным (нацыянальна-культурным) узроўні. Усе гэтыя моманты маюць каласальны духоўны, творчы патэнцыял. Адмова ад іх, звязаная са знікненнем нацыянальных культур, азначала б, такім чынам, і для паасобнага індывіда, і для ўсяго чалавецтва істотнае збядненне іх духоўнага жыцця і аслабленне яго творчага складніка. Абсалютна відавочна, што нават у працэсе прыняцця аператыўных эканамічных ці палітычных рашэнняў важная не толькі яго хуткасць, але і якасць, што грунтуецца на творчых здольнасцях адпаведнага функцыя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нера, якія ў сваю чаргу ў значнай ступені абумоўліваюцца яго далучанасцю да назапашаных яго народам культурных скарбаў.

Разам з тым, хоць мы трывожна канстатуем наяўнасць уніфікацыйных тэндэнцый, што пагражаюць нацыянальна-культурнай самабытнасці [1, с. 6, 8], іх перамога, іх татальнае панаванне ў сацыякультурнай рэчаіснасці немагчымыя ў сучасных умовах і наўрад ці зробяцца магчымымі калі-небудзь у прышласці. У пэўнай ступені пра гэта сведчыць і гістарычны досвед чалавецтва: у імперскіх палітычных утварэннях заўжды распачынаўся нацыянальна-вызваленчы рух, які садзейнічаў іх аслабленню і разбурэнню.

Неабходна адзначыць, што феномен нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці істотным чынам праблематызуецца і на пэўных кірунках сучаснага філасофскага пошуку. Дадзеная праблематызацыя грунтуецца найперш на тым, што ў другой палове XX стагоддзя не самы зайздросны лёс напаткаў катэгорыю ідэнтычнасці ўвогуле. Філосафы, якіх мы ўпарта называем постмадэрністамі, нягледзячы на іх уласны скепсіс у дачыненні да такой іх характарыстыкі, імкнуліся выштурхнуць яе з авансцэны філасофскага дыскурсу, фаварызуючы пры гэтым супрацьлеглую ёй катэгорыю рознасці [2]. У рэчышчы такога падыходу ставіцца пад пытанне і панятце нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці. Гэта мае месца ў рамках канцэпцыі транскультурнасці, распрацаванай сучасным нямецкім філосафам В. Вельшам [3]. В.Вельш востра крытыкуе традыцыйнае разуменне культуры як гамагеннага, скарэляванага з творчай дзейнасцю пэўнай этнічнай супольнасці ўтварэння, якое імкнецца вытрымаць ціск знешніх уплываў і захаваць сябе насуперак ім. Філосаф падкрэслівае, што ў сучасных умовах (а ў нейкай ступені не толькі ў сучасных) няма і не можа быць такіх утварэнняў: кожнае з іх характарызуецца татальнай унутранай дыферэнцыяцыяй і неймавернай разнастайнасцю знешніх дачыненняў, улучаючы ў сябе пры гэтым элементы, аспекты, уласцівасці, што паходзяць з розных культур. У сувязі з гэтым трывалая нацыянальна-культурная ідэнтычнасць ператвараецца ў фантом (і, як лічыць В. Вельш, фантом досыць небяспечны: менавіта на яго грунце паўстаюць міжкультурныя канфлікты, культурны фундаменталізм і да т. п.).

Што перашкаджае, аднак, разглядаць нацыянальна-культурную тоеснасць як гнуткую, рухомую і адначасова як грунтоўную, трывалую (момант стабільнасці, пераемнасці здзяйсняецца ў той ці іншай ступені ва ўсіх працэсах)? І хіба не можа яе руплівец быць адкрытым для дыялога з прадстаўнікамі іншых культур, з носьбітамі іншай нацыянальнай ідэнтычнасці? Чаму праз міжкультурны дыялог, праз узаемадзеянне розных нацыянальна-культурных традыцый павінны паўставаць эклектычныя, няпэўныя ўтварэнні? Чаму, нарэшце, згаданыя традыцыі нельга інтэрпрэтаваць як адметныя ўвасабленні агульначалавечага пачатку, што робіць іх блізкімі і цікавымі адна адной? Неабходна аддаць належнае В. Вельшу



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

за яго памкненне абгрунтаваць прынцып талерантнасці ў міжкультурных стасунках, аднак прызнанне грунтоўнай значнасці нацыянальна-культурнай адметнасці і скіраваных на яе захаванне стратэгій зусім не абавязкова вядзе да культурнага фундаменталізму, шавінізму ці імперыялізму.

У філасофскім плане найбольш адэкватнай падставай для згаданых стратэгій падаецца класічная дыялектыка, згодна з якой ідэнтычнасць на самай справе тоесная рознасці, бо яна змяшчае гэтую апошнюю як свой неад'емны момант; абедзве разглядаюцца, такім чынам, у абсягу дыялектычнай традыцыі як глыбока ўзаемазвязаныя і ўзаемаабумоўленыя. У адпаведнасці з гэтым нацыянальна-культурная тоеснасць павінна мець багаты на вызначэнні, змястоўны, канкрэтны характар; аплодненая рознасцю, яна не збаіцца ўступіць у дыялог са сваім іншым, бо толькі праз такі дыялог яна можа па-сапраўднаму зразумець сябе і здзейсніцца ў найбольш адэкватнай форме.

Такім чынам, нацыянальна-культурная тоеснасць і адметнасць ва ўмовах глабалізацыі зусім неператварылася ў анахранізм. Яна мае грунтоўнае духоўнае значэнне, высокі каштоўнасны статус. Таму павінны быць прыкладзены ўсе магчымыя намаганні дзеля захавання нацыянальна-культурных традыцый, нацыянальна-культурнай разнастайнасці, паліфаніі ў духоўным жыцці чалавецтва.

*Спіс літаратуры*

1. Конан, У. Беларуская альтэрнатыва: глабалізацыя і нацыянальнае адраджэнне / У. Конан // Нацыянальныя пытанні: матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый». – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001. – С. 5–12.

2. Aylesworth, G. Postmodernism / G. Aylesworth // The Stanford Encyclopedia of Philosophy [Electronic resource]. – Mode of access: http: plato.stanford.edu/archivs/sum2013/entries/postmodernism.

3. Welsch, W. Transculturality – the Puzzling Form of Cultures Today / W. Welsch // Spaces of Culture: City, Nation, World / ed. by M. Featherstone, S. Lash. – London: Sage, 1999. – P. 194–213.

**А. М. Байчоров**

*(Белорусский государственный университет, г. Минск, Беларусь, albaichorov@mail.ru)*

## ЕВРАЗИЙСКАЯ И ЕВРОПЕЙСКАЯ ИНТЕГРАЦИЯ

Чувствуя свою неспособность контролировать мировые процессы, порожденные глобализацией, национальные государства пытаются найти способы как-то приспособиться к ним. Одной из основных форм приспособления стало создание межгосударственных интеграционных объе-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ